Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

2. **Бем, Юзеф Захариаш** [Электронный ресурс] // Wikizero. – Режим доступа: https://www.wikizero.com/ru/%D0%91%D0%B5%D0%BC,_%D0%AE%D0%B7%D0%B5%D1%84_%D0%97%D0%B0%D1%85%D0%B0%D1%80%D0%B8%D0%B0%D1%88. – Дата доступа: 02.03.2020.

3. **Вясна** народаў [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%92%D1%8F%D1%81%D0%BD%D0%B0_%D0%BD%D0%B0%D1%80%D0%BE%D0%B4%D0%B0%D1%9E. – Дата доступу: 02.03.2020.

4. **Bem de Cosban, W.** Generał Józef Bem, 1794–1850; szkic biograficzny w 75-tą rocznicę śmierci / Włodzimierz Bem de Cosban. – Lwów ; Warszawa ; Kraków : Wydawnictwo Zakładu Narod. im. Ossolińskich, 1925. – 57, [3] s., [3] ark. tab. ; il., tab.

5. **Bitwa** pod Krechowcami [Zasoby elektroniczne] // Wikipedia. – Tryb dostępu: https://pl.wikipedia.org/wiki/Bitwa_pod_Krechowcami. – Data dostępu: 26.02.2020.

6. **Wojciechowski, J. S.** Polsko-węgierskie symbole pamięci generała Józefa Bema [Zasoby elektroniczne] / Wojciechowski J. S. – Tryb dostępu: http://bazhum.muzhp.pl/media//files/Niepodleglosc_i_Pamiec/Niepodleglosc_i_Pamiec-r2010-t17-n1_(31)/Niepodleglosc_i_Pamiec-r2010-t17-n1_(31)-s89-97/Niepodleglosc_i_Pamiec-r2010-t17-n1_(31)-s89-97.pdf. – Data dostępu: 24.02.2020.

*Рассматривается фрагмент книжной коллекции (1900–1930-е гг.) Несвижской ординации Радзивиллов из фонда Центральной научной библиотеки НАН Беларуси, дана краткая характеристика. Акцент сделан на издании, посвященном жизни и деятельности неординарного человека, талантливого военачальника, национального героя Польши и Венгрии Юзефа Бема (1794–1850).*

*The article discusses a fragment of the book collection (1900–1930s) of the Nesvizh ordination of the Radziwills from the fund of the Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus, gives a brief description. The emphasis is on the publication dedicated to the life and work of an extraordinary person, a talented military leader, national hero of Poland and Hungary, Jozef Bem (1794–1850).*

***Жук Т.І.*** *(Мінск)*

# ЯНКА ШУТОВІЧ І ЯГО ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА Ў ФОНДЗЕ АДДЗЕЛА РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ імя ЯКУБА КОЛАСА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

У 1968 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) у аддзеле рэдкіх кніг быў створаны сектар рукапісаў. Была разгорнута інтэнсіўная работа па камплектаванні фонду рэдкімі і каштоўнымі рукапіснымі дакументамі, якія ў асноўным былі сканцэнтраваны ў фондах асабістага паходжання. У 1970-я гг. бібліятэка набыла архівы вядомых вучоных, акадэмікаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. Мацапуры (1908–



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by
1971), І. Краўчанкі (1902–1979), П. Глебкі (1905–1969), класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага (1893–1938), дакументы з архіва народнага пісьменніка Беларусі Я. Брыля (1917–2006), пісьменнікаў і паэтаў У. Дубоўкі (1900–1976), Ю. Гаўрука (1905–1979) і інш. У гэты ж перыяд рукапісны фонд аддзела ўзбагаціўся вельмі цікавымі з пункта вывучэння беларускай гісторыі і культуры асабістымі архівамі заходнебеларускіх грамадска-культурных дзеячаў: А. Станкевіча (1892–1949), А. Клімовіча (1900–1970), празаіка, драматурга, перакладчыка У. Пігулеўскага (1889–1958), этнографа, фалькларыста, публіцыста С. Сахарава (1880–1954), мастака Я. Драздовіча (1888–1954), сярод якіх адметнае месца займае рукапісны фонд беларускага грамадскага і культурнага дзеяча, літаратуразнаўца і выдаўца Янкі Шутовіча (1904–1973) [3, с. 392].

Янка Шутовіч нарадзіўся ў в. Шутавічы Ашмянскага павета Віленскай губерні (цяпер Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці) у сялянскай шматдзетнай сям'і. У роднай вёсцы набываў пачатковую асвету, затым скончыў народнае вучылішча ў в. Сукневічы. Некаторы час вучыўся ў беларускай школе пры дзіцячым прытулку, арганізаваным яго дзядзькам ксёндзам В. Шутовічам у в. Бараздзенічы. Скончыўшы ў 1924 г. Віленскую беларускую гімназію, Я. Шутовіч паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Падчас вучобы працаваў карэктарам у беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, а таксама ў Беларускім інстытуце гаспадаркі і культуры. У 1934 г. Шутовіч атрымаў дыплом магістра права, але ў буржуазнай Польшчы ўладкавацца па спецыяльнасці выпускніку-беларусу было амаль немагчыма, і таму ён быў вымушаны выконваць самую разнастайную працу. Асноўным напрамкам дзейнасці Я. Шутовіча ў гэты перыяд становіцца публіцыстыка. Першая яго публікацыя, артыкул «Таварыства беларускае школы ў Вільні», падпісаны крыптанімам Я. Ш-ч, з'явіўся ў 1927 г. у «Беларускім календары» [1, с. 97–100], але большасць артыкулаў (пра Ц. Гартнага, А. Гурыновіча, П. Труса, М. Машару, Я. Драздовіча, Ш. Руставелі) датуюцца 1932–1939 гг.; яны друкаваліся ў газеце «Беларуская крыніца», у часопісах «Калоссе», «Шлях моладзі». З 1935 па 1939 г. Шутовіч быў адказным рэдактарам і выдаўцом аднаго з самых вядомых заходнебеларускіх перыядычных выданняў – літаратурна-навуковага часопіса «Калоссе» (1935–39). За актыўную дзейнасць у справе беларускага нацыянальнага адраджэння ён быў зняволены польскімі ўладамі ў Картуз-Бярозаўскі канцэнтрацыйны лагер, адкуль быў вызвалены ў 1939 г. савецкімі войскамі. З 1940 г. Я. Шутовіч сумяшчаў пасаду выкладчыка ў Беларускай настаўніцкай семінарыі з працай навуковага супрацоўніка, а потым і дырэктара Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні. Падчас фашысцкай акупацыі ён разам са сваімі супрацоўнікамі здолеў найбольш каштоўныя музейныя экспанаты захаваць у склепе касцёла Святога Міхала, адміністратарам якога ў той час быў вядомы дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння ксёндз А. Станкевіч.

У лістападзе 1944 г. Я. Шутовіч быў арыштаваны органамі НКУС і асуджаны на дзесяць гадоў зняволення, пакаранне адбываў у Горкаўскай і Карагандзінскай абласцях. У 1954 г. быў вызвалены, жыў у ссылцы ў Карагандзе і Саране, пасля яе вярнуўся ў Вільнюс. У 1958 г. быў рэабілітаваны, справа ў адносінах да яго была спынена за недаказанасцю віны.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Пасля смерці Я. Шутовіча ў 1973 г. (па іншых звестках у 1974 г.) частка хатняга архіва трапіла да яго сястры В. Клімовіч, якая раней перадала ў ЦНБ НАН Беларусі дакументы свайго мужа – беларускага грамадскага дзеяча, публіцыста і выдаўца А. Клімовіча (1900–1970) [14]. У 1974 г. ад В. Клімовіч бібліятэка атрымала асноўную частку дакументальнай спадчыны Я. Шутовіча, асобныя матэрыялы былі набыты ў яго пляменніцы ў пачатку 1975 г.

Асабісты фонд Янкі Шутовіча налічвае 414 адзінак захавання за 1906–1973 гг. і складаецца з творчых дакументаў, дакументаў да біяграфіі, матэрыялаў аб службовай і грамадскай дзейнасці, эпісталярыя, ілюстрацыйных матэрыялаў, дакументаў калекцыйнага характару і інш. [13].

Сярод творчых рукапісаў Шутовіча ў архіве захавалася вялікая колькасць матэрыялаў да яго артыкулаў пра вядомых дзеячаў беларускай культуры: рэвалюцыянера, паэта-дэмакрата, фальклярыста А. Гурыновіча (1869–1894), паэта, празаіка, публіцыста Ф. Багушэвіча (1840–1900), класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага (1893–1938), выдатнага спевака М.Забэйду-Суміцкага (1900–1981). Шэраг артыкулаў Я. Шутовіча прысвечаны знойдзенаму ім рукапісу рамана-хронікі М. Гарэцкага «Віленскія камунары». У склад творчых дакументаў увайшлі пераклады твораў беларускіх і літоўскіх пісьменнікаў, якімі Шутовіч займаўся разам з жонкай, літоўскай паэткай Онай Міцютэ, а таксама артыкулы па пытаннях беларускай мовы, захавання помнікаў беларускай культуры і інш. Нельга не адзначыць і грунтоўны нарыс, прысвечаны гісторыі Віленскага беларускага музея, але надрукаваным яго аўтар так і не ўбачыў. Асобныя артыкулы публікаваліся ў беларускіх перыядычных выданнях, але, на жаль, большасць з іх так і засталася ў рукапісах.

Архіў утрымлівае вельмі каштоўныя і рэдкія дакументы за 1936–38 гг., што адкладаліся падчас рэдакцыйнай і выдавецкай дзейнасці Я. Шутовіча ў часопісе «Калоссе». У вельмі няпростых грамадска-палітычных умовах, якія склаліся ў Заходняй Беларусі ў 1930-х гг., калі на хвалі ўзмацніўшыхся рэпрэсій з боку польскіх улад ліквідаваліся беларускія гімназіі, зачыняліся беларускія школы, была забаронена дзейнасць Таварыства беларускай школы і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, з'яўленне новага часопіса, безумоўна, было адметнай падзеяй. У склад яго рэдакцыйнай калегіі ў розныя часы ўваходзілі вядомыя заходнебеларускія грамадска-палітычныя і культурныя дзеячы: А. Станкевіч, С. Грынкевіч, М. Пецюкевіч, А. Бярозка.

Да Янкі Шутовіча, як да адказнага рэдактара і выдаўца, трапляла ўся рэдакцыйная карэспандэнцыя. Сярод аўтараў былі як ужо вядомыя беларускія літаратары, так і тыя, што толькі спрабавалі свае сілы ў літаратуры. Рэдакцыя атрымлівала ад чытачоў шмат лістоў з ацэнкай дзейнасці часопіса, да якіх, як правіла, былі дададзены і літаратурныя творы. Асобныя, найбольш цікавыя з іх, друкаваліся ў чарговых нумарах «Калосся», некаторыя вярталася аўтарам, але шмат рукапісаў заставалася ў рэдакцыі. Магчыма, што пасля закрыцця часопіса гэтыя дакументы захоўваліся ў хатнім архіве Шутовіча.

Сёння не шмат звестак ёсць пра жыццё і творчасць беларускага культурна-асветніцкага дзеяча, літаратара Францішка Грышкевіча (1905?–1946?) [15, с. 165–166]. Тым больш каштоўнымі для даследчыкаў з'яўляюцца рукапісы яго



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

вершаў «Калі народ...», «Чорны летапіс», «А заўтра ўжо...», «Смерць Івана», «З паэмы "Дзясятая рота"», датаваныя 1935 г., якія зберагаюцца сярод дакументаў рэдакцыі часопіса «Калосся» [13, адз. зах. 93, л. 1–8], а таксама адзінае пісьмо Грышкевіча з Прагі за 1928 г. і аўтограф верша, прысвечанага Я. Шутовічу пад назвай «Ода» [13, адз. зах. 388, л. 1, 2]. Зараз цяжка высветліць, якім чынам у архіве захаваўся рукапіс «Оды», тым больш, што гэты верш пералічаны ў спіску кніг і рукапісаў, якія былі канфіскаваны падчас вобыску ў кватэры Шутовіча ў лістападзе 1944 г. У гэты спіс былі ўнесены шматлікія матэрыялы рэдакцыі часопіса «Калосся»: паштоўкі і пісьмы розных асоб, рукапісы літаратурных твораў, рахункі і квіткі аб паштовых пераводах, сшыткі з адрасамі падпісчыкаў і інш. [13, адз. зах. 242, л. 42–44]. Такім чынам, шмат дакументаў адносна дзейнасці рэдакцыі выдання было знішчана, таму тыя, што засталіся, сёння для нас уяўляюць асаблівую каштоўнасць.

Нельга не адзначыць наяўнасць у архіве вершаў беларускага паэта, культурнага і грамадскага дзеяча, заслужанага доктара медыцыны Анатоля Бярозкі (сапр. Смаршчок Мацвей (Мітрафан) (1915–2008), які пакінуў пасля сябе параўнальна невялікую паэтычную спадчыну [3, с. 552–553]. Літаратуразнавец, гісторык беларускага нацыянальнага руху XX ст. А. Ліс пісаў: «Паэт Анатоль Бярозка <...> доўгі час заставаўся постаццю невядомай, таямнічай нават для адмыслоўцаў у літаратуры», пры гэтым адзначаў, што яго першыя паэтычныя творы сведчылі «...пра ўласнае мастацкае ўспрыманне свету маладым аўтарам, пра яго арыентацыю на вечныя каштоўнасці: родную зямлю, яе людзей (народ), прыроду як крыніцу жыцця, харaства» [8, с. 207]. Своеасаблівай і цікавай была структура і стылістыка вершаў А. Бярозкі, якія ў 1930-х гг. друкаваліся ў віленскіх перыядычных выданнях. Пасля 1939 г. звестак пра публікацыі паэта няма, і толькі ў 1989 г., знаходзячыся ў эміграцыі, Бярозка выдаў невялікі зборнік вершаў, напісаных у 1930-х гг. з аўтарскім перакладам на англійскую мову [4]. Безумоўна, аўтографы вершаў А. Бярозкі «І сустрэнь мяне, о поле...», «Ён выйшаў на загон» (абодва 1936), «Сягоння ты гэтак блізка... » (1938) з'яўляюцца вельмі каштоўнай крыніцай для даследавання творчасці паэта, тым больш, што апошні яго твор, магчыма, так і застаўся ў рукапісе [13, адз. зах. 97, л. 1–3]. Захаваліся ў рэдакцыйным архіве «Калосся» і рукапісы 1930-х гг. з літаратурнымі творамі М. Танка, М. Машары, Н. Тарас, Я. Пачопкі і іншых, якія яскрава адлюстроўваюць працэс станаўлення і развіцця новай беларускай літаратуры.

На сёння не засталося ніякіх актаў і запісаў пра час і колькасць кніг з бібліятэкі Я. Шутовіча, якія былі перададзены ў ЦНБ НАН Беларусі. Асобныя з іх, відавочна, былі набыты ў Шутовіча яшчэ пры яго жыцці, некаторыя бібліятэка атрымала разам з рукапісным архівам ужо пасля яго смерці. У кніжным фондзе аддзела ў калекцыі кніг на беларускай мове XIX–XX стст. захоўваецца невялікая колькасць асобнікаў з дарчымі надпісамі Я. Шутовічу, што дазваляе залічыць іх да кнігазбору літаратара.

Самы ранні надпіс за 1935 г. выяўлены на адным з першых зборнікаў вершаў М. Машары «На сонечны бераг!»: «Дарагому і вельмі паважанаму сябру Янку Шутовічу – на памятку аб нашым першым спатканні. Міхась Машара. Таболы 23.VIII.35» [9].



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Даўняе сяброўства звязвала Я. Шутовіча з М. Танкам, які дзякуючы свайму таленту ўжо ў 1930-я гг. упэўнена ўвайшоў у заходнебеларускую літаратуру. Свой першы зборнік вершаў «На этапах» М. Танк падпісаў Шутовічу ў 1936 г.: «Дарагому і паважанаму Янку Шутовічу з шляху супольнай барацьбы за лепшае заўтра беларускага народу…» [11]. Вядома, што амаль увесь тыраж зборніка на другі дзень пасля выхаду быў канфіскаваны польскімі ўладамі і таму асобнік з аўтографам аўтара сёння з'яўляецца сапраўдным рарытэтам. У калекцыі кніг на беларускай мове захоўваюцца яшчэ дзве кнігі М. Танка з дарчымі надпісамі: паэма «Нарач» [12] і першы том збору твораў паэта, выдадзены ў 1958 г. і падараваны сябру з подпісам: «На добры ўспамін Янку Шутовічу гэтыя песні з родных і далёкіх дарог…» [10]. Сярод выданняў з кнігазбору Шутовіча ёсць тыя, што ўвогуле захаваліся ў адзінкавых экзэмплярах. Кніжны фонд аддзела змяшчае два асобнікі з аўтографамі Р. Зямкевіча (1881–1943 ці 1944). Першы – невялікая па аб'ёме праца «Аб беларускай народнай эстэтыцы», выдадзеная ў Вільні ў выглядзе асобнага адбітка. На добрую памяць ахвяраваў, па словах аўтара, «дробную сваю працу» паважанаму грамадзяніну Я. Шутовічу ў 1939 г. Р. Зямкевіч [5]. Другі асобнік з дарчым надпісам Р. Зямкевіча беларускаму этнографу, грамадска-культурнаму дзеячу, літаратару М. Пецюкевічу (1904–1983), належыць да кнігазбору П. Глебкі [6]. Улічваючы той факт, што Зямкевіч трагічна загінуў у гады Другой сусветнай вайны ў канцлагеры і большая частка яго рукапісаў і збораў па гісторыі беларускай літаратуры і культуры загінула, згаданыя выданні маюць вялікую каштоўнасць для даследчыкаў беларускай гісторыі і культуры [2, с. 537].

Нельга не засяродзіць увагу на невялічкім зборніку вершаў Т. Лебяды (1914–1970) «Песні выгнання» з надпісам: «Спадару Шутовічу ў знак глыбокай пашаны. Вільня 1944 г. Аўтар» [7]. Гэта першы і адзіны паэтычны зборнік Т. Лебяды, які складаецца з вершаў, у большасці напісаных у сталінскіх лагерах [3, с. 634–35]. Выданне выйшла з друку хутчэй за ўсё ў лютым 1944 г. у Вільні, дзе і было падпісана Шутовічу. Нейкім чынам гэты асобнік не трапіў у спіс дакументаў, канфіскаваных падчас вобыску на кватэры Шутовіча і зараз гэта адзіны экзэмпляр у фондзе ЦНБ НАН Беларусі. Безумоўна, выданні такога кшталту з кнігазбору Шутовіча з'яўляюцца неад'емнай часткай яго творчай спадчыны, вывучэнне якой дае больш поўнае ўяўленне пра творчую і асветніцка-выдавецкую дзейнасць аднаго са слаўных дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння, садзейнічае вывучэнню літаратурнага працэсу ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг. і з'яўляецца важнай інфармацыйнай крыніцай па гісторыі, навуцы і культуры Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Беларускі** каляндар на 1927 год. – Вільня, [1926]. – 110 с.
2. **Беларускія** пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі ; Беларус. энцыкл. ; Нац. навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Верабей – Іваноў. – 1993. – 541 с.
3. **Беларускія** пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі ; Беларус. энцыкл. ; Нац. навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны. – Мінск, 1992–1995. – Т. 6 : Талалай – Яфімаў / Дадатак. – 1995. – 684 с.




Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by
4. **Бярозка, А.** Адзінаццаць вершаў / А. Бярозка. – Бел. ін-т навукі і мастацтва ў ЗША. – Мінесота, 1989. – [27] с.
5. **Зямкевіч, Р.** Аб беларускай народнай эстэтыцы : спроба характарыстыкі / Р. Суніца. – Вільня, [1927]. – 4 с.
6. **Зямкевіч, Р.** Адам Ганоры Кіркор / Р. Зямкевіч. – Вільня, 1911. – 9 с.
7. **Лебяда, Т.** Песьні выгнаньня / Т. Лебяда. – Мінск, 1944. – 29 с.
8. **Ліс, А.** Анатоль Бярозка : як малітва аб волі / А. Ліс // Gloriavictis : збор тв. – Мінск, 2010. – С. 207–212.
9. **Машара, М.** На сонечны бераг! : зборнік вершаў / М. Машара. – Вільня, 1934. – 78 с.
10. **Танк, М.** Збор твораў : у 2 т. / Максім Танк. – Мінск, 1958. – Т. 1 : Вершы і паэмы. – 443 с.
11. **Танк, М.** На этапах : вершы / Максім Танк. – Вільня, 1936. – 127 с.
12. **Танк, М.** Нарач : паэма / Максім Танк. – Вільня, 1937. – 100 с.
13. **Цэнтральная** навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 1. – Воп. 1.
14. **Цэнтральная** навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 5. – Воп. 1.
15. **Энцыклапедыя** гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1993–2003. – Т. 3. – 1996. – 527 с.

*Рассматривается состав рукописного архива общественно-культурного деятеля Западной Беларуси Я. Шутовича. Помимо кратких биографических сведений вводятся в научный оборот документы о его редакционно-издательской деятельности, отмечены книги с дарственными надписями из библиотеки Я. Шутовича.*

*The article considers the composition of the handwritten archive of the social and cultural figure of Western Belarus Y. Schutovich. In addition to brief biographical information, documents on his editorial and publishing activities are introduced into scientific circulation, books with gift inscriptions from the library of Y. Schutovich are noted.*

***Дзенісенка А.П.*** *(Мінск)*

# БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ЗАМЕЖНЫЯ ВЫДАННІ Ў КАЛЕКЦЫІ АДДЗЕЛА РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ імя ЯКУБА КОЛАСА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ: АГЛЯД

У фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) захоўваецца калекцыя пад шыфрам «КСк», яе працоўная назва – «Скарынаўская калекцыя». Калекцыя была сфарміравана ў 2016 г., адразу пасля яе паступлення ў ЦНБ НАН Беларусі ў якасці часткі фонду Бібліятэкі Нацыянальнага навукова-


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by